# Злучнікі und, aber, oder

1. Злучнікі **„und“**, **„aber“**, **„oder“** злучаюць самастойныя сказы, звязанныя па сэнсе.

2. Пасля злучнікаў **„und“**, **„aber“**, **„oder“** могуць стаяць:

- дзейнік (пры прамым парадку слоў):

  **Er** bleibt in der Sporthalle **und** **ich** gehe auf den Sportplatz.

- любы дадаены член сказа (пры адваротным парадку слоў):

  Zuerst gingen **wir** über die Brücke **und** dann liefen **wir** durch den Park.

3. Калі два сказы, дзеянне ў якіх выконвае адна і тая ж асоба, злучаюцца з дапамогай злучніка „und“, то ў другім сказе пры прамым парадку слоў дзейнік апускаецца:

**Ich** heiße Hanna **und** komme aus Deutschland.

Пры адваротным парадку слоў дзейнік захоўваецца ў ободвух сказах:

Zuerst mache **ich** die Hausaufgabe **und** dann gehe **ich** mit meinen Freunden Fußball spielen.

4. пасля злучнікаў **„aber“** і **„oder“** дзейнік паўтараецца ў абодвух сказах:

Gehst **du** am Wochenende schwimmen **oder** spielst **du** zu Hause am Computer?